

Download



"Вясна" назірае

⚡⚡**Крычалі "Жыве Беларусь" на канцэрце "Пошлая Молли". Дырэктара івэнт-агенцтва аштрафавалі на 2175 рублёў за парушэнне парадку правядзення канцэрту**

8 чэрвеня ў судзе Кастрычніцкага раёна Мінска прайшоў суд над **дырэктарам івэнт-агенцтва Антонам Сасноўскім**, які арганізоўваў канцэрт групы «Пошлая Молли» 26 траўня. На дырэктара склалі пратакол па **ч.2 арт. 24.23 КаАП** (парушэнне ўстаноўленага парадку арганізацыі або правядзення масавага мерапрыемства) згодна з якім, «**26 траўня з 19:00 да 22:00 Сасноўскі, парушыў парадак арганізацыі і правядзення канцэрта гурта "Пошлая Молли", падчас якога прысутныя грамадзяне выказвалі свой грамадска-палітычны настрой шляхам выкрыкванне лозунгаў "Жыве Беларусь!"**». Відэа «правапарушэння» выявілі супрацоўнікі міліцыі 30 траўня ў адным з тг-каналаў.

Сасноўскі патлумачыў **суддзі Аляксандру Рудэнку,** што «дадзены інцыдэнт адбыўся падчас канцэртнай паўзы, якая ўзнікла па прычыне тэхнічнай няспраўнасці і ў той час, калі калектыў арганізатараў займаўся ліквідацыяй дадзенай тэхнічнай няспраўнасці, для таго, каб канцэрт змог працягнуцца і арганізаваць бяспеку гледачоў. **Выкрыкі лозунгі наведвальнікаў доўжыліся не больш за 30 секунд і ў поўным аб'ёме трапілі на відэа**». Па словах Сасноўскага, за ўсе шэсць гадоў дзейнасці ніколі з гэтым не сутыкаліся і былі цалкам занятыя ліквідацыяй няспраўнасці і не ведалі, як на гэта рэагаваць і якія меры прымаць. Пасля паходу ў РУУС **івэнт-агенства атрымала поўныя інструкцыі і рэкамендацыі па ўзаемадзеянні,** і наступны канцэрт фірмы, арганізаваны праз тры дні, прайшоў без інцыдэнтаў і ў поўнай адпаведнасці з Законам аб масавых мерапрыемствах і Кодэксам аб культуры.

⚖️У выніку, **суддзя Рудэнка** прызнаў **Антона Сасноўскага** вінаватым і **аштрафаваў на 2175 рублёў (75 базавых велічыняў).**

t.me/viasnanazirae/357
6.6K viewsJun 8, 2021 at 11:48

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy